Ужасный случай детоубийства не так давно произошёл в д. Дягелец Берёзовского района.

В доме жителей этой деревни был обнаружен мёртвый 4-месячный ребёнок.

По заключению судмедэкспертов, смерть наступила от закрытой черепно-мозговой травмы, перелома височной кости и кровоизлияния в мозг. Установлено, что убийство с целью избавления от ребёнка совершил отец. Он теперь под следствием в ожидании суда.

Нина МАРЧУК.
г. Берёза.

Абвяржэнне

У адпаведнасці з рашэннем Івацэвіцкага суда ад 5 кастрычніка 2001 года, вынесенага па іску жыхара вёскі Падстарынь Івацэвіцкага раёна Сцяпана Кандратавіча Прыступчыка да рэдакцыі "Газеты для вас", і якое ўступіла ў сілу з 19 лістапада 2001 года ў адпаведнасці з пастановай Брэсцкага абласнога суда, мы вымушана абвяргаем звесткі, змешчаныя ў артыкуле Святаслава Кажадуба "Знявечаная старасць" ("Як праводзілі бабулю ў апошні шлях"), надрукаваны ў "Газеце для вас" за 9 - 15 лютага 2001 года, а менавіта такія:

называнне імені "Сцяпанка";

"І тут пачалося самое дзіўнае... Тады разламаў яе і звярнуўся за дапамогай да майстра-сталяра";

"Калі спускалі ў магілу труну, Сцяпанка зняў з яе пакрывала... — Усё роўна згніе, — са злосцю адказаў Сцяпанка, — якая вам справа";

"Як сказалі боркаўцы, пляменнік нябожчыцы ўсё ж раскашаліўся ў той вечар і паставіў на стол дзве паўлітроўкі гарэлкі... Вось такія памінкі атрымаліся па роднай цётцы";

"Што забраў сабе Сцяпанка з хаты, дзе жыла цётка, боркаўцы не ведаюць, але вось карову завёў у Падстарынь у свой хлеў";

"Праўду казала адна з жыхарак Борак, што "аднаго нябожчыка хаваюць у нас з аркестрам, з шыкоўнымі памінкамі на сотні чалавек, а другога, як бы не чалавека, а жывёлу".

(Працяг.
Пачатак у № 46, 47, 48).



КАРАЛЕВА ЖЫВОГА СЛОВА і пакутлівай праўды

III. "УСЁ ГЭТА ЗРАБІЎ СА МНОЙ І ВА МНЕ ГОД 1863-ці..."

1.

Працягваючы думку аб сваіх Людвіноўскіх універсітэтах, жыцці на Палессі, Эліза Ажэшка прызнавалася: "Там я прайшла вышэйшую школу велізарных назіранняў, грамадскіх і эстэтычных уражанняў. Усё гэта зрабіў са мной і ва мне год 1863-ці. Калі б не яго молат і разец, мой лёс быў бы іншым і, відаць, я не стала б пісьменніцай".

Прызнанне Ажэшкі аб тым, што асновай яе многіх твораў сталі назіранні і падзеі 1858—1864 гадоў, пацвярджаюцца яе творчасцю, усім яе далейшым жыццём. А яно складвалася пасля Людвінова зусім нялёгка. У Мілкаўшчыне, куды яна вярнулася, канкрэтнага занятку не знайшла. Была ў Варшаве і Гродне. Ведаючы чатыры мовы (польскую, французскую, крыху слабей рускую і нямецкую, а пасля Людвінова і беларускую), Эліза Ажэшка думала знайсці працу настаўніцы ці ў крайнім выпадку тэлеграфісткі. Аднак у сталіцы Каралеўства Польскага, дзе ўся ўлада належала рускім, уладкавацца на работу не ўдалося. На Элізіна прашэнне царскі чыноўнік адказаў, што ёй, як полькы, у дзяржаўных установах працы даць не могуць.

2.

"Не магу апісаць уражання, зробленага на мяне гэтым фактам, — абураецца Эліза Ажэшка. — Ужо вярнуўшыся дадому, я ўсё яшчэ пры кожным успаміне літаральна дрыжала ад абурэння не за сябе, а амаль выключна за нас. Як гэта? У Варшаве мы, палякі, не маем права працаваць!.. Я ўжо ведала тады, што на зямлі існуе нешта такое, што называецца дзяржаўнымі меркаваннямі, але я не хацела мірыцца з усім тым, што існуе".

На вачах самой Ажэшкі адбывалася тое, што яна лічыла "незразумелым". Заваёўнікі ў асобе царскіх уладаў паводзілі сябе так, як ім хацелася. Словам, царскі ўрад стаў на шлях жорсткай забароны свабоднай думкі і слова. На беларускіх і польскіх землях пачалася суцэльная русіфікацыя. Руская мова была ўведзена ва ўсіх школах і ўстановах. Усе нярускія выданні на тэрыторыі так званага Паўночна-заходняга краю спецыяльным загадам былі забаронены.

Антырускае паўстанне і рэформа 1861 года расчысцілі шлях да капіталізму. Беззямельныя сяляне атрымалі кавалкі зямлі да трох маргоў (адзін морг — 0,56 га). Паранейшаму засталіся буйныя памешчыцкія землеўладанні. Маёнткі шляхты, што мела дачыненне ці ўдзельнічала ў паўстанні, былі канфіскаваны і перададзены царскім чыноўнікам.

У гэтых умовах Элізе Ажэшка, як удзельніцы геаічнага паўстання, і ў той жа час без дастатковай адукацыі і прафесіі, трэба было самой вырашаць, чым займацца, якую выбраць дарогу ў далейшым жыцці.

3.

Па-першае, Эліза Ажэшка засталася на роднай беларускай зямлі, іменна на той зямлі, якая ўзгадавала яе сваім хлебам. Праўда, Мілкаўшчына пасля паўстання была спустошаная. Да таго ж даймалі даўгі.

Па-другое, пераканаўшыся ў тым, што ў Мілкаўшчыне яна не знойдзе якую-небудзь працу, і, шукаючы выхаду з тупіковага становішча, яна вырашае хоць са страхам, але заняцца літаратурнай дзейнасцю.

Чаму іменна літаратурнай дзейнасцю?

Варта прыгадаць, што яшчэ ў дзяцінстве Эліза напісала невялікае апавяданне, і яе родныя і выхавальніца прадказвалі ёй бліскучую будучыню пісьменніцы. Успомнілася Ажэшкі не толькі гэта. Жывучы ў Людвінове і маючы шмат свабоднага часу, Эліза многа чытала, спрабавала і пісаць.

"У зімовыя вечары, — успамінала Ажэшка, — калі не было гасцей, я пісала то адно, то другое, то думкі якія-небудзь, то заўвагі аб навакольных людзях, так званыя мае "празаічныя строфы", у якіх пісала тое, чаго я нікалі і нікому не магла б сказаць".

Тут жа, як лічаць даследчыкі, пісьменніца перакладала творы Байрана, канспектавала гісторыю напалеонаўскіх паходаў. Людвіноўскія рукапісы, на жаль, да нас не дайшлі. Па ўсім відаць, яны былі знішчаны самой пісьменніцай.

Менавіта гэты, Людвіноўскі вопыт Элізы Ажэшкі, вельмі спатрэбіўся ёй тут, у Мілкаўшчыне, калі яна зноў і ўжо назаўсёды вярнулася ў літаратуру.

4.

Пасля доўгіх роздумаў Эліза Ажэшка прыйшла да высновы, што яна надта мала ведае, каб пісаць і навучаць іншых. Выратаваннем у гэтай справе стала праца, напружаная праца над самаадукацыяй.



Францішак Багушэвіч, паэт-дэмакрат, удзельнік паўстання 1863—1864 гг., сябра Элізы Ажэшкі.

Таму яна многа чытала, чытала і вучылася, пры тым у розных аўтараў — ад пісьменнікаў да вучоных. Звярталася нават да прац Дарвіна і Шэдлера.

З цікавасцю маладая жанчына знаёміцца з творамі Бальзака і Шэкспіра. Яе літаральна ашаламілі раманы Віктара Гюго, Жорж Санд і дапамаглі па-новаму глянуць на самога чалавека, на ягоны характар.

Настойліва займаючыся самаадукацыяй, Эліза адначасова спрабуе выкладаць на паперы і свае думкі: "У мяне ярка бліснула думка, што на гэтай ніве я магу паслужыць таму, што любіла больш за ўсё..., што жыло і плакала ў маёй душы, што я называла — радзіма" ("Аўтабіяграфія").

Даследчыкі сцвярджалі, што Эліза Ажэшка стала пісьменніцай па шчаслівай выпадковасці, надрукаваўшы ў часопісе "Тыднёвік ілюстраваны" вясной 1866 года апавяданне "Малюнак з галодных гадоў". Але так здараецца толькі ў казках. Было дзяцінства з першымі расткамі творчасці, былі даволі творчыя і пакутлівыя гады ў Людвінове, і, нарэшце, два гады вучобы і творчай працы ў роднай Мілкаўшчыне.

З 1864 па 1866 год Эліза Ажэшка напісала чатыры вялікія творы. "Людзі і чэрві" і "Маршалак" — гэта раманы пра толькі што адшумеўшыя падзеі 1863—1864 гадоў. "Беата" — гэта расказ збяднелай дзяўчыны-шляхцянкі, якая стала настаўніцай. Чацвёртым было апавяданне пра Густава Ваза. Яно стала вынікам вывучэння гісторыі Швецыі.



Дом Элізы Ажэшкі ў Гродне. Зараз тут музей.



Пакой Элізы Ажэшкі ў Гродне.

5.

Такім чынам, шмат вады выцякла, як кажуць, шмат перажыта і аддадзена працы, перш чым паявілася ў свет апавяданне "Малюнак з галодных гадоў".

"Я памятаю хвіліны, — зазначае Эліза Ажэшка, — калі блакітнае світанне, падаючы на мой стол, рабіла святло лямпы падобным да святла грамнічнай свечкі і прымушала мяне ўзнімаць галаву ад спісанай паперы... Я ўсхоквала, выбягала з дома, адпраўлялася на палоску лугу... У траве, у расе, пад лісцем дрэў, нібы пазалочаных косымі промнямі сонца, я стаяла, хадзіла — бадзёрая, вясёлая, перапоўненая радасцю жыцця".

У аснову апавядання "Малюнак з галодных гадоў" лягла адна сумная падзея, што адбылася на беларускім Палессі, у Людвінове, незадоўга да прыезду туды Элізы. Гэта было ў галодныя 1853—1856 гады для прыгоннай вёскі. Мужыцкая сям'я Гарвара памірае ад голаду, а панскі двор у той жа час купаецца ў раскошы. Галодная смерць не пашкадавала маладую сялянскую пару Ганку з Васількам, якія, па ўсім відаць, мелі правa на каханне і шчасце. Паміраюць іх маленькія браты і сёстры. Маці і бацька Ганкі, схуднелыя і сівыя, пакідаюць сваю хату разам з лапінкай зямлі і ідуць жабраваць па свеце.

Голад — гэта вынік не толькі аднаго не ўраджаю, а таксама і цяжкага эканамічнага становішча заходніх ускраін расійскай імперыі — Польшчы, Беларусі і Літвы.

У мастацкіх адносінах гэтае апавяданне яшчэ недасканалае, але жыццёвая праўда, чалавечая трагедыя прымушае ўздрыгнуць нават самага чорcтвага чалавека.

6.

Апавяданне "Малюнак з галодных гадоў" (1866 г.) лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці Элізы Ажэшкі, яе літаратурны дэбют. Імя пісьменніцы становіцца вядома шырокаму колу чытачоў. А яе літаратурная праца — яе прафесіяй, яе адзінай зброяй, і, вядома, адзіным сродкам для жыцця. Прызначэнне мастацтва, як сцвярджае Эліза Ажэшка, — адлюстроўваць рэальнае жыццё. Літаратура бярэ свае вытокі з жыцця, служыць выяўленнем духоўнага жыцця грамадства.

У першым сваім артыкуле "Некалькі заўваг аб рамане", які быў змешчаны ў "Газеце польскай", пісьменніца пісала: "Сёння агульнапрызнана, што літаратура з'яўляецца праўдзівым адбіткам рыс грамадства, у якім яна развіваецца, вытокам яго патрэб і меркай інтэлектуальнага жыцця".

І далей: "Грамадства нараджае пісьменнікаў, і сіла іх — у сувязі з грамадствам".

Словам, думкі Элізы Ажэшкі аб літаратуры скіраваны ў будучыню. Гэта яскрава відаць з твораў, напісаных у Мілкаўшчыне (1864—1869 гг.), і ў далейшай творчасці пісьменніцы.

Дарэчы, у 1869 годзе Эліза Ажэшка нарэшце прадае свой маёнтак і пераязджае на новае месца жыхарства — у старажытны беларускі горад Гродна, дзе пражыла звыш сарака гадоў, дзе напісала свае лепшыя творы. Літаратурная творчасць стала справай усяго яе жыцця.

7.

"Мае аповесці і навелы другога і трэцяга дзесятка год маёй літаратурнай дзейнасці не толькі лепшыя за папярэднія, — сама ацэньвала напісанае Эліза Ажэшка, — але неяк як бы зусім іншыя ў параўнанні з імі".


І пісьменніца мела рацыю. У пачатку 70-х гадоў яна набывае папулярнасць на радзіме і за яе межамі ў першую чаргу як перадавы барацьбіт за вызваленне жанчыны з путаў дамашняга рабства. Каб абысці цэнзурныя рагаткі, Эліза Ажэшка стараецца выкарыстоўваць розныя жанры, часам гаварыць іншасказальна і ў сваіх артыкулах, і ў сваіх творах.

Аповесць "Марта" (1873 г.) атрымала шырокі водгук не толькі ў так званым Паўночна-заходнім краі, але і за мяжой. Можна смела сказаць, што гэта адзін з лепшых твораў Элізы Ажэшкі, які прысвечаны жаночаму пытанню. Голад, бяднота, а потым гібель Марты, якая не мела права зарабіць хлеба для сябе і для дзіцяці, былі не толькі праўдзівым малюнкам жыцця польскай і беларускай жанчыны ва ўмовах тагачаснай рэчаіснасці, але і пратэстам пісьменніцы супраць несправядлівасці панавання расійскай уладаў.

Новыя і новыя творы выходзяць з-пад пяра Элізы Ажэшкі: раман "Паны Пампалінскія" (1876 г.), аповесці "Элі Маковер" (1877 г.), "Магутны Самсон" (1878 г.), "Меер Эзафовіч" (1879 г.), два тамы апавяданняў "З розных сфер" (1880 г.).

Святаслаў КАЖАДУБ.
Івацэвічы — Драгічын.

(Працяг будзе).




ВОЛЬНЫ РЭГІЁН



Коллекционирование так же старо, как история человечества. Из чего состояла первая в мире коллекция: из раковин, камней, костяных изделий? Сегодня предметов для коллекционирования намного больше, чем в ту доисторическую эпоху. И по всей видимости, ничто так не популярно у коллекционеров всего мира, как почтовые марки. Сегодняшний наш собеседник — Алексей Матвеевич Толмачёв — инженер кинотеатра "Октябрь" г. Берёза, а за рамками основной работы — филателист с 25-летним стажем.

Наша марка не хуже иностранной

– считает филателист Алексей Толмачёв



Хранитель марок Алексей Матвеевич Толмачёв с одной из своих коллекций.

Увлечение

Алексей Матвеевич:

— Увлекаться марками я начал под конец своей армейской службы, в 74-м году. К тому времени у меня уже были какие-то марки. Однажды один мой знакомый, увидев их, предложил познакомиться с местными филателистами. В 1975-м году нас, коллекционеров, собралось человек двенадцать, и мы зарегистрировались уже как организация — Берёзовское городское отделение Всесоюзного общества филателистов. Зачинателем нашего общества стал Геннадий Степанович Вистунов.

Сейчас мы называемся Берёзовское городское отделение Общественного объединения Белорусского союза филателистов.

— Если я захочу в него вступить, что для этого нужно?

— Желание и вступительный взнос, больше ничего. Если вам 16 лет исполнилось, приходите и вступайте. Даже заявление не пишется. Мы заводим карточку и в неё записываем, что вы будете собирать.

— А что вас привело к коллекционированию марок?

— Интерес. Я служил в авиации, и мне удалось собрать кое-какие марки по этой теме. Затем на советских марках появилась живопись. И не какой-нибудь ширпотреб, а картины Леонардо да Винчи, Рембрандта, Рубенса. Начал собирать и их.

В 80-е годы кроме живописи у меня собралась неплохая подборка семейства кошачьих, олимпийских игр и космоса. Космос я собрал практически весь, за исключением 3-х марок с изображениями аэростатов 1930-х г. Они для нас были недоступны. Сейчас продолжаю собирать эти четыре главные для меня темы. Кроме того, я собирал хронологию Советского Союза — все марки, выпускавшиеся в этой стране.

Чем дольше собираешь марки, тем интерес к ним возрастает всё больше и больше. Пик увлечения филателиста — выставка. Когда-то в Бресте я выставлял свою коллекцию марок "Космос".

— Марки каких стран вы собираете?

— Всего мира.

— А чем определяется ценность коллекции?

— Полнотой. Чем более полна коллекция, тем она ценнее. Для филателиста ценность коллекции определяется ещё и количеством сил, времени, средств, затраченных на её собрание. За редкой маркой можно гоняться годами.

— Что даёт человеку увлечение марками?

— Увлечение марками даёт развитие. Узнаёшь, например, что кошек существует всего 3 вида — длинношерстные, короткошерстные и полудлинношерстные. Потом оказывается, что их 200 с лишним семейств, и т.д. и т.п. Некоторые учёные даже пишут научные труды на тему марок.

— Не отомрёт ли традиционная переписка и марка в связи со всё большим распространением электронной почты?

— Я думаю, марки будут существовать.

Марки из... космоса

— Марки имеют 26 разновидностей, по разным направлениям почты: марки голубиной, полярной, санной, спешной, авиапочты. Авиапочта, например, выпускает специальный конверт и специальные марки. Деньги за них идут в фонд авиа. Только при наличии соответствующих конверта и марки письмо отправится авиапочтой. А если наклеить любую попавшуюся, то нет. Есть посольские марки — только для отправки за границу. Есть марки, оплачивающие только посылки, газеты, бандероли. Есть марки нетонущей почты, космической и другие.

— Что, уже существует и космическая почта?

— Космическая почта появилась, когда Гречко жил на орбитальном комплексе "Мир". Он был там первым почтмейстером. Ему даже прислали специальный штемпель. Когда на станцию прилетает новый космонавт, он привозит с собой письма от друзей, почту. Всё это штемпелюется. Затем ребята на орбите написали ответные письма, опять же, проштемпелевали, отправили на Землю.

Есть ещё и ракетная почта. Она появилась, когда в 1932-34 гг. начали массово выпускать ракеты. Допустим, почту с Кубы переправляли в Америку с помощью ракет. Правда, было одно неудобство — ракеты с письмами иногда терялись.

Наши

— Чем интересны белорусские марки?

— Марки каждой страны отличаются чем-то своим, особенным. Белорусские марки, фактически, не отошли от советских. Георгий Димитров, болгарский коммунист, как-то сказал: "Марка — это визитная карточка страны". В марке отображено всё: и культура, и экономическое состояние, и уровень развития техники. Если взять, например, вьетнамские марки, то бумага у них плохая, зубцы разные — рваные, неровные. Технически они тоже слабы. А марки, выпущенные в Союзе под вьетнамским флагом — совсем другие. Сейчас белорусские марки — это хорошая полиграфия, бумага, но у нас иногда для блоков нет отдельной зубцовки. Блоки идут беззубцовые, это минус.

Сегодня Беларусь выпускает марки по тематикам: символы, архитектура, ремёсла (если в России это космос, нефть, газ, то у нас — гончарное ремесло, плетение из соломки и т.д.). Есть картины Шагала, спорт, флора, фауна, юбилейные даты, знаменитые люди — всё, чем живёт наша республика. Вышла даже белорусская марка с голограммой. Так что в плане марок мы не отстаём ни от России, ни от других стран.

Что касается тиражирования марок, то Белпочта делает это, на наш, филателистический, взгляд, неправильно. В результате инфляции марки, как и деньги, обесцениваются. У нас слишком большие тиражи — миллионов 10-15. А Беларуси надо миллиона полтора, не больше. На обесцененные марки почта ставит надпечатки и снова пускает их в ход. Сейчас, правда, найден другой выход для защиты от инфляции — выпускаются конверты с буквой "А" или с нарисованной оригинальной маркой с буквой "А". С первой же белорусской маркой с изображением креста Ефросиньи Полоцкой вообще произошёл уникальный случай: в 1992 году она стоила один рубль по своему номиналу. Минуло почти десять лет, прошла деноминация, и в 2001 году эта марка по-прежнему стоит 1 рубль согласно номиналу.

— А какая самая дорогая белорусская марка?

— Сейчас самые дорогие в Беларуси марки с изображением картин М. Шагала, напечатанные в Англии в 1993 г. Их номинальная стоимость 1500 рублей, но даже по каталогам Белпочты реальная цена в несколько раз выше. Это потому, что тираж маленький, примерно 200 тысяч, и часть его осталась в Англии.

А на сегодняшний день Белпочта выпустила марку номиналом в 5000 рублей. Её у меня пока ещё нет.



Редкий случай ошибки на марке: церковь во имя преподобного Серафима Саровского в г. Белоозёрске изображена с золотыми куполами, в то время как в действительности церковные купола белые.



А вот эту белорусскую марку "EUROPA 2000" вам в Беларуси не купить. Она сделана по совместному проекту европейских государств, где каждая страна выпустила свой марочный лист.

Марки — это ещё и деньги

— А в чём вообще заключается ценность марки?

— Марка особо ценится, если она использовалась по прямому назначению и приклеена к конверту. В Москве, например, за неплохую сумму можно купить конверт с письмом Гагарина. Баснословную цену имеют дореволюционные российские марки.

Чем меньше тираж марки, тем она ценнее. Сейчас, например, в мире существует марка Британской Гвианы в единственном экземпляре. Она невзрачная, но единственная в мире. Её нашёл мальчик на старом бабушкином конверте. Потом обменял у торговца на экзотическую серию животных. У торговца её купил какой-то француз и выставил у себя. Знатоки стали обращать на неё внимание. Он начал искать её по каталогам. В каталогах нет. За 125 фунтов эту марку у француза купил Феррари — знаменитый коллекционер. Он завещал свою коллекцию Берлину, там был единственный в мире музей марок. После первой мировой войны Германия вынуждена была распродавать свои музейные марки. И тогда эту марку продали уже за 34000 долларов. А в 1972 году она появилась на аукционе и была продана за 500000 долларов. Марка стала ценной бумагой, стоимость которой с каждым годом растёт.

— На марках встречаются ошибки?

— Бывает, но редко. На белорусских марках попадаются, в основном, мелкие — плохо пропечатан какой-то элемент, цвет.

— Часто подделывают марки?

— Об этом не пишется, но в мире — да! Как и деньги, некоторые марки имеют защиту. На белорусских, например, где-нибудь маленькими неприметными буквами написано слово "Беларусь". Марки могут иметь и ультрафиолетовую защиту.

— А Вам попадались поддельные?

— Редко. И я их не брал. Некоторые люди специально собирают поддельные.

Ложка дёгтя

— Какие преимущества даёт членство в союзе филателистов?

— Раньше давало многое. Допустим, в Советском Союзе в год выпускалось 2-3 малотиражных блока марок, предназначенных специально для филателистов, уплативших членские взносы. У нас в городе было 60 коллекционеров, и нам присылали 60 вот этих блоков. Членов общества тогда было много, потому что было легче в финансовом плане. А сейчас хуже, цены нас совсем задавили. В этом году из тех бывших шестидесяти филателистов осталось лишь 20. Потому что наше руководство из Минска прислало нам распоряжение: в 2000-2001 гг. годовые взносы собирать в размере одной "минималки". Кто успел, в начале года заплатил 3600 рублей, в марте уже надо было платить 5700, в мае — 7500, сейчас — 10000.

— Сейчас в Беларуси выпускаются марки, предназначенные только для филателистов?

— Недавно, в надежде на то, что у нас богатые филателисты, на общество прислали марки с изображением цветов на 3600 рублей. И прислали такой же набор из шести марок с белорусскими костюмами — тоже на 3600. Это дорого. Такой блок надо продавать хотя бы за тысячу рублей. И если раньше за общество люди держались, то сейчас оно фактически распадается, т. е. быть филателистом попросту накладно. Если у нас раньше было 50-100 детей, то в этом году — ни одного. Среди взрослых остались лишь самые заинтересованные.



Первая белорусская марка. Спустя 9 лет она по-прежнему в обращении и по-прежнему стоит 1 рубль, несмотря на проведённую деноминацию.

Полосу подготовил
Николай СИНКЕВИЧ,
фото автора.

БАЦЬКАЎ ПРЫТУЛАК

Той сакавіцкай раніцай першай у хату да Івана Сітніка завітала Анютка Богдан. Гэтая вясковая жанчына была нейкім чынам адметнай з'явай маленькай вёскі. Не, некалі паселішча было даволі вялікім. На кожным падворку бегалі дзеці, сакаталі куры, рыкалі каровы. Але старэе вёска, і паабапал адзінай доўгай вуліцы шмат дзе стаяць хаты, вокны якіх забіты дошкамі. Мруць старыя, а моладзь даўно па гарадах раз'ехалася. І ў Анюткі дзве дачкі ў горадзе, але яна пасля смерці мужа трымаецца сваёй хаты. Казалі, што яна ніколі ў хаце печ не паліць. Як устане, выйдзе на двор і цікуе, у каго з коміна дым ідзе. Туды і шыбуе. Нягледзячы на гады, а мінула ёй ужо семдзесят пяць, валасы ў яе кучаравыя, без адзінай сівінкі. Твар пухкі, але, калі прыглядзецца, раскіданы на ім чырвоныя рысачкі. Так, у якой хаце запросяць госцю да стала, нальюць талерку булёну, а у каторай і чарачку свежага першака пададуць. Вось і ходзіць Анютка з хаты ў хату. У адной паслухае, у другой раскажа так цікава і захапляльна, што шчырыя гаспадары запрашаюць прыходзіць ізноў. Весялей бягуць аднастайныя, асабліва зімовыя, дні і вечары на вёсцы. Але ў хаце Івана Сітніка жанчына ніколі не была: гаспадары кожную хвіліну шчыравалі на падворку, не было ім часу прысесці.

●

Аднак той сакавіцкай раніцай, праходзячы паўз хату Сітнікаў, пачула Анюта нейкі лямант. Хуценька адчыніла дзверы, прайшла цераз утульную кухню з чыста пабеленай печчу і падалася на гукі, якія даносіліся з маленькага пакойчыка, аддзеленага пярэстай доўгай фіранкай. Перад ложкам, на якім ляжала гаспадыня дома, яшчэ не старая Галена, стаяў на каленцах Іван і нема скуголіў, як пакрыўджанае дзіця. Аднаго погляду было дастаткова, каб упэўніцца, што памерла гаспадыня раптоўна, у сне. Так, цяжка працавала, а лёгка памерла.

— Хопіць, Іванка, ёй ужо нічым не дапаможаш.

Анюта паклала руку на патыліцу мужчыны і ласкава правяла па сівых скудлачаных валасах.

— Не прападзеш. Як-та жыць будзеш. Так усе жывуць. У цябе ж шасцёра дзяцей, прытулак будзе.

Яна цяжка ўздыхнула пры гэтых словах і выйшла з хаты.

І пацягнуліся да Сітнікаў людзі. Жанчыны завіхаліся каля нябожчыцы. Пакуль прыехала з горада старэйшая дачка Вольга, маці ўжо ляжала прыбраная ў труне. І так ласкава ўсміхалася, што столькі людзей каля яе: суседзі, адна дачка з зяцем і ўнукамі, другая, сын з сям'ёй. Далі тэлеграмы Мішы, Васі і Колі, што памерла раптоўна маці. Але ж дарога да іх няблізкая.

У свой час паехалі хлопцы з дому на нафтаздабычу на Крайні Север. Гэта старэйшы, Міша, перацягнуў братоў. Добра зараблялі, абжыліся, а зараз жывуць і самі ледзь канцы зводзяць. Трэба ж дзяцей вучыць-карміць. Да бацькоў гадоў пяць не ездзілі. Дзе тых грошай на самалёт узяць.

Але бацькі не крыўдавалі. У Бярозе — старэйшая дачка, у Мінску — другая, сын жыве ў Пружанах. Тыя, што паблізу жывуць, праўда, і памагаюць бацькам. І бульбу пасадзяць, і сена накосяць на кароўку і коніка. А з астатнім Галена з Іванам самі ўпраўляліся.

Жылі заўжды ў дастатку. Толькі грыбы пойдуць, запрагуць коніка — і ў лес. Людзі каробку лісічак нясуць, а Сітнікі воз вязуць. За грыбы і цукар, і муку, і крупы мяхамі купляюць. І сабе, і дзецям дапамогуць. А бульбу тонамі здавалі.

Ніколі гаспадыня не сядзела, склаўшы рукі. Узімку ставіў Іван кросны сярод хаты, і доўгімі вечарамі Галена такія посцілкі прыгожыя ткала, што з музея прыязджалі, на выставу прасілі прадаць. Яна не прадавала, казала, што сям'я ў яе вялікая, трэба ўсіх — і дзяцей, і ўнукаў — адарыць. Каб памяць навек засталася. Ці паспела?

●

На другі дзень пасля пахавання Іван цяжка прачнуўся. Каля печы завіхалася Вольга, якая недарэчна грымела чапялой, што аж накрыўкі моцна бразгалі на чыгунках.

Хацеў спытаць, дзе ж маці падзелася, успомніў, і моцна, уголас, заплакаў. Паснедалі на могілках, куды па завядзенцы на другі дзень пасля пахавання прыходзіць адведваць нябожчыкаў.

Пыталіся ў Галены, як ёй там спіцца ў сырой зямельцы, але толькі ціхі ветрык шугаў па верхалінках хвояў.

І пацягнулася для Івана сірочае жыццё. Дзеці раз-пораз прыязджалі на выхадныя, але хапаліся за работу, якую ён і не прасіў рабіць. Каб хто слоўца ласкавае сказаў, каб хто так шчыра прыгарнуў да грудзей, як яго Галена калісь... А калі Іван стаў размаўляць з конікам, як з чалавекам, дзеці ўгаварылі прадаць спачатку кароўку, а потым і яго, статнага рабацягу Ромку.

Пятро, зяць, забіў вокны хаты дошкамі, і паехаў Іван да Вольгі ў горад. Некалі смяяліся вяскоўцы з тых, хто бег ад цяжкай працы ў добраўпарадкаваную кватэру на паверх, ці, як казалі, на салькі. Пасядзеў і ён на сальках мо паўгода. Раніцай бягуць дачка з зяцем на работу, дзеці ў школу. Увечары збяруцца, паелі і да тэлевізара, серыял бразільскі глядзець. А ўнук музыку такую слухае, што ў сківіцах апошнія зубы ныюць: "Фаты-фаты-фатыя..." І так цалюткі дзень.

— Дачушка, — як мага лагодней папрасіў Іван Вольгу, — хочу я да Светкі ў Мінск паехаць.

Паехаў. Як зірнуў з дзесятага паверха ў Малінаўцы на горад, так у галаве і закружыла. Машыны — з каробку ад запалак, а людзі, як мурашы, поўзаюць. А дочка з зяцем рады-радзёшанькі. У свой час яны дзяцей не хацелі, а калі пачалі шукаць — ужо не знайшлі. І ўзялі на выхаванне серабрыстага дога па мянушцы Ральф. Быў той сабака бы цялё добрае — гладкі, поўсць кароткая, з блакітным адценнем. Хітры, халера. Пантоплі гаспадыні прынясе, калі тая толькі ў кватэру зойдзе.

І загадалі Івану гуляць з сабакам. Тры разы на дзень. Зяць паказаў дарожку, дзе ўсе сабачнікі хадзілі. Іван ніяк не мог уцяміць, навошта трымаць у кватэры гэтую псіну. Смуроду ад яго, бы некалі ад вопраткі, у якой хлеў чысціў.

— Сярожка, а ты як думаеш, трэба нам гэты саюз з Расіяй? — спытаў неяк увечары Іван зяця.

Ён сам быў за яднанне, за тое, каб зноў адрадзіць вялікую краіну, за якую ён некалі кроў праліваў. Адным росчыркам пяра палітычных дзеячаў разышліся людзі па нацыянальных кватэрах. З'явілася валюта, мытні, межы, а сям'і раскіданы па свеце. Нібы чужынцы...

Яму так хацелася пагаварыць, паразважаць з маладым зяцем-інжынерам. І высвятлілася, што таму ўсё роўна, што будзе з краінай, хто ў той Амерыцы прыйдзе да ўлады, як у Беларусі будуць выбары праходзіць. Абы двухкамерны "Атлант" не страціў свае формы з-за адсутнасці ў ім прысмак. Абуралі зяцевы прагулкі па кватэры ў адных трусах. Чэрава пад кожны крок ёкала, бы ў добра адкормленай свінні. Але ж Сяргей тут гаспадар...

Калі сонца зноў павярнула на сакавік, папрасіўся Іван дахаты. Светка плакала, упрошвала бацьку застацца. Іван глядзеў праз набраклыя вільгаццю вочы на малодшую дачушку і думаў, што лёс не даў ёй долі. А якая ж яна была лагодненькая ў дзяцінстве, добра вучылася. Коскі былі доўгія, тоўстыя, як тыя дубцы. І браты ніколі не крыўдзілі малую, але лёс у яе такі паганы...

●

Здарожыўшыся, Іван сяк-так адбіў дошкі з кухоннага акна, трохі прапаліў у печы. У хаце ледзь пацяплела, але стала курна ад дыму: доўга не палілі. Гаспадар трохі перакусіў тым, што паклала дачка і, накрыўшыся коўдрай і старым паліто, заснуў. Перад самай раніцай прысніўся сон. Ён, малады, здаровы, п'е малако з гладышкі. Яно смачнае і халоднае. Галена, маладая, прыгожая, цёплай далонню выцірае з яго шыі белы малочны ручаёк. Потым адышла ад яго кудысьці, а Іван застаўся адзін з пустой халоднай гладышкай.


IREX/ProMedia.

Нешта бразнула па клямцы ў сенцах. Іван падняўся з ложка і ледзь дайшоў да дзвярэй.

— А я то думаю, хто ў хату Сітнікаў залез, — Анютка паднялася на дыбачках і заглянула цераз плячо. — Прыехаў... Э-э, чалавеча, пэўна, нідзе няма лепш, як у сваёй хаце.

Але к вечару Іван занядужыў. Сухі моцны кашаль разрываў грудзі, кідала то ў жар, то ў холад. Ноч сяк-так перабыўся, а раніцай пайшоў да Марыі, суседкі, каб выклікала фельчарку, Наталлю Іванаўну. Такая яна ўважлівая да старых, такая сардэчная, што людзі да гэтай маладой прыгожай жанчыны бы да маці роднай гарнуліся.

Наталля Іванаўна прыехала надвячоркам на веласіпедзе. Доўга церла слухаўкі, але яны ўсё роўна былі для Івана халоднымі.

Моцна ўздыхнуўшы, жанчына села за стол пісаць.

— Дзядзька, я вас накіроўваю ў бальніцу. Мяркую, што запаленне ў вас. Ды і сэрца... Трэба трохі падлячыцца.

Словы гэтыя чуліся як бы скрозь вату. Ён зноў заснуў, а калі расплюшчыў вочы, каля яго стаяла Наталля Іванаўна.

— Падымайцеся, Іван Сяргеевіч, "скорая" па вас прыехала. У бальніцу павязем.

Іван трохі ачуняў і пачаў ужо цікавіцца жыццём. Доўга і прагна ўглядаўся ў асфальтаваны гасцінец, на звароце якога ў мястэчка стаяла сельская бальніца. Калі з-за пагорка паказваўся чырвоны вялікі "Ікарус", людзі падыходзілі да брамы. Тыя, хто прыехаў з горада праведаць хворых, хуценька беглі да іх, кідалі пакункі з гасцінцамі, забіралі пусты посуд і беглі назад да рэйсавага аўтобуса, які заходзіў у вёску, разварочваўся і праз дзесяць-пятнаццаць хвілін вяртаўся ў горад.

Вольга з Пятром да бацькі прыязджалі па выхадных. Заспакоілі яго, што ў гародзе бульбу пасадзілі. І сад так хораша цвіце... Ад гэтых навін вельмі хацелася дадому, але малады доктар з кароткай бародкай толькі незадаволена нешта бурчаў. Курс лячэння пройдзены, аднак аналізы кепскія. З горада хірурга прывозілі. Ён мяў Іванаву параненую ў вайну нагу, якая знянацку апухла, як булка.

Хірург, таксама з бародкай, уважліва выслухаў свайго калегу, а потым і старога, і даў слушную параду:

— Больш хадзіце, салдат, не залежвайцеся.

Цяжка, але трэба, і з кійком у руцэ пачаў Іван патроху дыбаць па сцяжынках вакол бальніцы. А аднойчы ногі так затрэсліся, што ледзь дакрочыў да ганку. Нейкая жанчына падтрымала яго пад руку:

— Не спяшайся, Іванка, я дапамагу...

— Адкуль вы мяне ведаеце? — зацікавіўся ён.

— Хіба ты не пазнаеш, Іванка? — ціха прамовіла жанчына.

Не, ён ніколі не бачыў гэтую старую.

●

Увечары, калі трохі стала лягчэй, выйшаў Іван на двор. Убачыўшы тую жанчыну, як да добрай знаёмай падышоў да яе.

— Добры вечар, — адказала тая. — Сядайце.

І далонню правяла па лаўцы, нібы смецце змяла.

Завязалася гаворка, спачатку пра хваробы, пра медыкаў, пра тое, хто лепш, хто спрытней робіць уколы. Потым і пра старэчыя гады. Іван бедаваў пра свае адзіноцтва, расказаў, што пражыў з Галенай сорак восем гадоў, а зараз, як сірата, адзін гаруе.

— І я адна вякую, — ціха прагаварыла жанчына.

— Чаму так? Хіба ніхто не знаходзіўся? — спытаў зацікаўлена Іван.

— Я думала, што ты прыйдзеш у сваты да мяне...

— Дык гэта ты, Надзейка?

І маладосць успомнілася, як учора гэта было. Разам з бацькамі не бачылі свету з-за работы, але на танцы беглі, хаця і не было ў што апрануцца. Памятае, як ціскалі хлопцы, ды і ён сам, дзявочыя няспелыя грудзі. Але Надзю яму заўсёды хацелася песціць, бы малую, каб, крый Божа, і словам не абразіць.

Потым была ў яго жыцці вайна. Вярнуўся з яе пасталелым на сотню гадоў. Пабраліся яны з Галенай, каб у згодзе ды ладзе жыць, гадаваць-вучыць дзяцей. І жыццё, як пясок праз пальцы, працерушылася...

Выпісаўся Іван з бальніцы, а на другі дзень на фурманцы паехалі яны з Анютай Богдан у Грыцэвічы, сватаць Надзю. Старэйшая яе сястра, Матруна, злосна губы скрывіла:

— Як хоча, так таму і быць...

А сярэдняя, паралізаваная Люба, усё хрысціла здаровай правай рукой Надзю і Івана.

Забралі "маладыя" пяць курак і галасістага пеўня, прывязалі да возу двух козачак і на другі дзень разам з вясёлымі сватамі рушылі назад.

Іванавы дочкі, калі пачулі пра бацькаву жаніцьбу, прамаўчалі.

Неўзабаве прыехаў сын Валодзя з Пружан. Доўга незадаволена хадзіў па падворку, а потым, калі Надзя пайшла даіць козачак, запатрабаваў:

— Паехалі, бацька, у горад, да натарыуса. Трэба хату адпісаць...

— Каму, сынок? — здзівіўся стары, — я ж яшчэ жывы... І Надзя... Паспееце, усё ваша будзе.

— Глядзі, бацька, каб позна не было, — са злосцю кінуў сын.

Моцна бразнуўшы дзвярыма, ён выйшаў з хаты. Не развітаўшыся, сеў за руль і шпарка рушыў з бацькоўскага двара.

Людміла СЕВЯРЫНЕЦ.

Сердечно поздравляем

Дорогого и любимого мужа и папочку Николая Васильевича БАСИКА из г. Белоозёрск поздравляем с днём рождения. Желаем крепкого здоровья, счастья, успехов во всём, семейного благополучия и всего самого наилучшего.

С любовью — жена и доченька Женька.



От всей души поздравляем с днём рождения Марию Станиславовну ВОЛЧЕК из д. Миловиды Барановичского р-на.

Милая, хорошая, родная. В день твоего рождения хотим мы счастья пожелать, удачи, радости, успехов. Здоровой быть, беды не знать, долгих лет и всего самого наилучшего.

С любовью — сёстры Галина и Анна.



Поздравляем с днём рождения Наталью ЮМАШЕВУ из г. Ивацевичи. Желаем счастья, здоровья, исполнения всех желаний, любви и всего самого наилучшего.

С уважением — семья Селедчик.



Дорогую, любимую дочь и сестру Марию Петровну ЛЕМЕШЕВСКУЮ из д. Наливки Ивацевичского р-на горячо и сердечно поздравляем с юбилеем.
Пусть этот день запомнится надолго,
Запомнятся все теплые слова.
Большого счастья, крепкого здоровья
Желаем мы на долгие года.
Не ищем мы красивых слов,
А просто от души желаем:
Здоровья, счастья и цветов,
И жизнь прожить, не унывая.
Желаем солнечного света,
Гостей за праздничным столом.
Пусть будет жизнь твоя согрета
Любовью, радостью, теплом!

С любовью и уважением — мама, сестра Валентина, брат Виктор и их семьи, а также семьи Черняк и Юруть.




Дорогую сестру, крёстную и тётю Валентину Евгеньевну КАЛЕСНИК из д. Гощево Ивацевичского р-на поздравляем с днём рождения. Желаем крепкого здоровья, семейного благополучия и всего самого наилучшего.

С любовью и уважением — сестра Таня и ее семья.



Дорогую, любимую жену и бабушку Марию Петровну ЛЕМЕШЕВСКУЮ из д. Наливки Ивацевичского района поздравляем с юбилеем.
Любимая наша, родная,
Эти нежные строки тебе,
Самой милой и самой красивой,
Самой доброй на этой земле.
Пусть печали в твой дом не заходят,
Пусть болезни уйдут стороной.
Мы весь мир поместили б в ладонях
И тебе подарили б одной.
Но и этого было бы мало,
Чтоб воздать за твою доброту.
Мы всю жизнь, наша милая мама,
Пред тобой в неоплатном долгу.

С любовью и уважением — твой муж, сын Геннадий, дочь Ольга, невестка Наталья, внуки Денис и Даниил.



От всей души поздравляем с днём рождения Тамару Александровну ШЕЙНА из г. Ивацевичи. Желаем счастья и добра, чтоб жизнь, как день, была светла. Здоровья, сил, любви и ласки, надежды, счастья, красоты, и пусть сбываются мечты.

С любовью и уважением — семьи Русаковичей, Миранюков и Светлана Николаевна Гулер.

Дорогую, любимую дочь, сестру и тётю Ирину Григорьевну МЕЛЕНЧУК из д. Добромысль Ивацевичского р-на поздравляем с 18-летием. В этот день желаем тебе счастья много-много, выбрать единственную правильную в жизни дорогу, здоровья, бодрости, веселья и прекрасного настроения.

С любовью — все родные и близкие.



Любимую доченьку Юлечку из г. п. Телеханы от всей души поздравляем с 7-летием. Желаем крепкого здоровья, всегда оставайся такой послушной, учись на 4 и 5.

С любовью — мама и брат Женя.



Поздравляю с днём рождения жену Нину НОВИК из д. Воля Ивацевичского р-на. Живи подольше, человек любимый. И главное, конечно, не болей. Поверь, что ты для меня одна на свете, любимее всех и родней.

С любовью — муж Александр.



От всей души поздравляю с днём рождения Нину НОВИК из д. Воля Ивацевичского р-на. Желаю счастья, здоровья, успехов, удачи, пусть она приносит радость, а рядом — хорошего и верного друга.

С уважением — кума Галя.



Поздравляю с 17-летием Андрея КОТА из д. Речки Ивацевичского р-на. Желаю счастья, здоровья, успехов во всём и везде и, конечно, огромной взаимной любви. Будь счастлив!

С любовью и уважением — Светлана.



Поздравляем любимого брата и сына Владимира БАЙБАКА из г. Пружаны с днём рождения. От всего сердца желаем счастья, удачи, а главное — здоровья.

С любовью и уважением — семья Зыбайло.




От всей души поздравляем с днём рождения Екатерину БАЙБАК из д. Яглевичи Ивацевичского р-на. Без лишних слов, но от души желаем здоровья, доброты на сотни лет. Будь счастлива.

С уважением — тётя Ира, дядя Володя, братья Дима и Виталий.




Дорогого и любимого мужа и папочку Дмитрия Михайловича КАРАЧУНА из г. Ивацевичи поздравляем с днём рождения.
Пожелания пусть сбудутся,
Ведь они от любви.
Говорим тебе сегодня мы —
Будь здоров, сто лет живи.
Пусть удача улыбается,
Пусть друзья не подведут,
И пусть солнце озоряет твой путь.

С любовью — жена, дети.




Горячо и сердечно поздравляем с днём рождения внучку Лизу СЕЛИФАНОВУ из д. Ходаки Ивацевичского р-на. Желаем крепкого здоровья, хорошего настроения, удачи, счастья.

С любовью — бабушка Дуся, дедушка Иван.



От всей души поздравляем с днём рождения Николая Валерьевича ЛИПОВКУ из г. Коссово. Желаем крепкого сибирского здоровья, кавказского долголетия, успехов во всех делах, счастья, прекрасного настроения и всего самого наилучшего.

С уважением — все родные и близкие.



ПРОДАЮТСЯ

РАЗНОЕ

☞ Холодильник, машина автомат, морозильная камера, печь СВЧ, факс — б/у, из Германии. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-36-81.

☞ Козы, покрытые первым и третьим козлением. Цены договорные. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-17-92 (после 19.00).

